# Прадмова рэдакцыі

Том 7 "Гістарычнага Альманаху" ўтрымлівае матэрыялы II навуковай канферэнцыі Беларускага Гістарычнага Таварыства "**Праблемы перыядызацыі гісторыі Беларусі**", якая адбылася 23 – 25 лістапада 2001 г. у Магілёве (удзельнікі на здымку).

Канферэнцыя была падзелена на 5 паседжанняў:

- **Перыядызацыя развіцця беларускай гістарычнай навукі**
- **Гісторыя культуры** (адбыліся 23.11.2001)
- **Гісторыя дзяржавы і права**
- **Эканамічная гісторыя краіны**
- **Гісторыя беларускага этнасу** (прайшлі 24.11.2001).

25 лістапада адбылася экскурсія па гістарычных мясцінах Магілёва і ад'езд удзельнікаў.

У томе публікуюцца не толькі навуковыя даклады і паведамленні, але і пытанні да выступоўцаў, іх адказы, а таксама выступы ў дыскусіі.

Як звычайна, не ўсе аб'яўленыя ў праграме выступоўцы змаглі прыехаць на канферэнцыю, таксама не ўсе з тых, хто выступіў, прадставілі тэксты да публікацыі. І наадварот, некалькі адсутных падчас канферэнцыі асобаў, даслалі свае тэксты, які мы публікуем асобным блокам.

Некалькі тэкстаў значна большыя памерамі за іншыя, бо арганізатары далі магчымасць аўтарам падаваць да друку пашыраны варыянт выступу.

